кантэксце выяўленчае мастацтва з'яўляецца своеасаблівай "скрыняй", адчыніўшы якую можна дакрануцца да духоўных набыткаў нацыі.

Такім чынам, сінтэз кніжнай і выяўленчай культуры, выдатнай архітэктуры з яе найноўшымі тэхналогіямі і матэрыяламі, сучаснага дызайну і ўсёй інфраструктуры Нацыянальнай бібліятэкі як эстэтычнага цэнтра, з'явіцца, на маю думку, бліскучым вынікам таго, аб чым так даўно марылі нашы творцы — манументалісты, архітэктары, скульптары, жывапісцы, графікі, майстры прыкладнога мастацтва, мастакі-афарміцелі, дызайнеры і інш.

Для мяне Віцебск не толькі "малая Радзіма", якая стала на многія гады крыніцай натхнення. Сёння Віцебск — як "культурную сталіцу" Беларусі, якая звязана з гісторыяй, музыкай, старажытнай архітэктурай, міжнароднымі фестывалямі мастацтваў і пленэрамі жывапісу, ведаюць ва ўсім свеце. Віцебск — гэта свята. Віцебск — гэта песня душы. Я імкнуўся паказаць мой, наш Віцебск з яго ратушай, цэнтральнай вуліцай і іншымі архітэктурнымі аб'ектамі праз музыку дажджу, праз сімвалічны натхнёны палёт чалавечых пачуццяў і эмоцый".



Л.Шчамялёў. "Музычны Віцебск". Алей.

## "Ладдзя часу" Уладзіміра Тоўсціка:

"Зразумела, гэта вялікі юнар стварыць для Нацыянальнай бібліятэкі творы, якія надоўга застануцца ў культурнай прасторы нашай краіны. Усе жывапісныя работы, якія ствараюць мае калегі, будуць выкананы на гладкім ляўкасе. Для недасведчанага чытача паведамляю, што ляўкас (ад грэчаскага Іеідкоз — белы), мелавы грунт рускага і сярэднявечнага жывапісу вырабляецца з мелавога або гіпсавага (алебастра) парашку на жывёльным або рыбным клеі. Накладваецца на цвёрдую аснову (у асноўным з дошак). Найбольш быў распаўсюджаны ў іканапісе. У насценных росписах робіцца з вапны з напаўняльнікамі (пясок, тоўчаная цэгла, дробна нарубленыя ільняныя валокны і інш.).

Мой трыпціх "Ладдзя часу", над якім я зараз працую, мяркуецца размясціць на першым паверсе кальцавога калідора, які быццам аталяе атрыум. Паводле мастацкай канцэпцыі інтэр'ера, ён прысвечаны гістарычнаму мінуламу Беларусі. Цэнтральная частка — ладдзя. У ёй па рацэ Часу плывуць гістарычныя фігуры-сімвалы: Еўфрасіння Полацкая, Леў Сапега, Мадонна і інш. Зразумела, вобразы сімвалічна-алегарычнага характару. Левая частка трыпціха актыўная — "Паляванне" часоў Міколы Гусоўскага, правая частка — спакойнае "Земляробства". Я ўмоўна ўзяў найбольш характэрныя сферы дзейнасці беларусаў эпохі Вялікага княства Літоўскага. Кампазіцыя будуецца на цёплай гаме, на пераклічцы колераў — золата з белым. Эскіз і падкардоннік манументальным Саветам ужо зацверджаны. Зараз я заканчваю кардон (у натуральную велічыню). Кожная частка трыпціха па вертыкалі — 190 сантыметраў: памер, адзіны для ўсіх жывапісных твораў якія ўвойдуць у прастору абодвух паверхаў кальцавых калідораў".

## "Айчына" Гаўрылы Вашчанкі

На чатырох частках адзінай кампазіцыі — агульнае неба. Бясконцае, цёплае і пранізлівае, як душа летуценніка. Неба Беларусі. Колер — золата з рубінам. Да выбеленых стагоддзямі аблокаў імчыць натхнёны анёл з трубой у руцэ. І адтуль, дзе жывуць толькі анёлы, з-пад неба, з-за аблокаў, гучыць гімн нашай мінуўшчыне і нашай будучыні...

У засені Сафійскага сабора — святая Еўфрасіння Полацкая. Неўтаймаваная і ціхмяная адначасова. Яна рушыць да гледача, каб блаславіць, каб наталіць смагу духоўнасці, каб знітаваць святарным агнём душы сваёй ссівелыя стагоддзі з днём сённяшнім. Пра гэта ж вядуць маўклівую гаворку старажытныя муры палаца Паскевічаў у Гомелі, Мірскага замка, Сынкавіцкай царквы-крэпасці, шапочуць старадрэвіны Гомельскага парку, хвалі мірскага возера...

Сваю працу Гаўрыла Вашчанка назваў "Айчына". Эскізы, падкардоннікі, кардоны ў натуральную велічыню (вышыня — 190 сантыметраў, шырыня — метр)... Выпрацоўка дэталей будучай кампазіцыі, манеры пісьма, насычанасці колеравай палітры — творчы пошук доўжыцца з лютага. Зараз майстар рыхтуе ўжо кардоны. А ў выніку ўся кампазіцыя будзе выканана на драўляных шчытах, ляўкасах, у тэхніцы энкаўстыкі і размесціцца, як мяркуе Гаўрыла Харытонавіч, на першым паверсе абодвух калідораў Нацыянальнай бібліятэкі.

— Першую частку твора, — расказвае мастак, — я назваў "Над Сожам", другую, дзе Мірскі замак, — "Памяць", трэцюю — "Святыні" (святая для нас не толькі Еўфрасіння Полацкая, але і Сафійскі сабор, сімвал нескрышальнай веры беларускай), чацвёртую — "Сынкавічы" (тамтэйшы храм абароннага тыпу унікальны не толькі дойлідствам, ён быў яшчэ і цэнтрам магутнай духоўнасці беларускай нацыі). Кожны з вобразаў кампазіцыі сімвалізуе дух беларушчыны, з'яўляецца, на мой погляд, тым непахісным апірышчам, на якім заўжды трымалася і, я ўпэўнены, будзе трымацца наша нацыянальная свядомасць...

Усе чатыры часткі ў абрамленні. Яго, як і элементы па левым і правым баках кампазіцыі (гербы абласцей Беларусі, апавітыя слуцкімі паясамі), выконваюць па эскізах Вашчанкі мастакі-металісты.

— Нацыянальную бібліятэку, для якой зараз працую, — даводзіць Гаўрыла Харытонавіч, — лічу шэдэўрам дойлідства. Сапраўдны ўзор архітэктурнага мастацтва дваццаць першага стагоддзя! Бачыў у свеце шмат бібліятэк, з нашай — ніякага параўнання! Унікальны па сваёй шматфункцыянальнасці комплекс. Сапраўды, працаваць над аздабленнем бібліятэчных памяшканняў — гонар для любога мастака!



Т.Кіршына. "Адлюстраванне". Фарфор, глазуры, падглазурны роспіс.

## "Адлюстраванне" Тамары Кіршынай

Тамара Кіршына — мастачка непаўторнай індывідуальнасці. Яе керамічныя творы вылучаюцца высокім прафесійным майстэрствам і багаццем палітры вобразнага асацыятыўнага мыслення. Ёй уласцівыя складаныя, шматдэтальныя кампазіцыі з празрыста чытаемай агульнай структурай. Яна заўсёды цудоўна адчувае лінію, фактуру і колер. Манументальнае пано (трыпціх) "Адлюстраванне" (фарфор, глазуры, падглазурны роспіс), якое плануецца ўсталяваць у кафэ Нацыянальнай бібліятэкі, з'яўляецца менавіта прыкладам вытанчанасці, вышуку, унутранай канструктыўнай логікі і пераканаўчай пластыкі, дзе багатая фактура глазураў цудоўна ажыўляе геаметрычную статыку форм.

Матэрыялы падрыхтавалі
Барыс КРЭПАК і Яўген РАГІН